Традыцыйныя званкі па суботах

Мінгарвыканкам і аблвыканкамы правядуць 11 ліпеня чарговыя прамыя тэлефонныя лініі.

Рэспубліканская і рэгіянальная ўлада адкажа на званкі насельніцтва. На прамой тэлефоннай лініі — гарадскія і абласныя выканаўчыя камітэты, а таксама кіраўніцтва раёнаў.

У кожнага ахвотнага ў чарговы раз будзе магчымасць задаць пытанне і атрымаць грунтоўны адказ па хвалюючай праблеме. Як паказваюць вынікі дыялогу, найбольш актуальнымі зараз з'яўляюцца «летнія пытанні»: расклад транспарту да дачных кааператываў, графік адключэння гарачай вады, праца часовых рынкаў.

У гэтую суботу з 9.00 да 12.00 на сувязь выйдуць:

Брэсцкі аблвыканкам

Сакоўскі Віктар Яўгенавіч — намеснік старшыні, 80162213121;

Віцебскі аблвыканкам

Белавус Уладзімір Мікалаевіч — намеснік старшыні, 80212204260;

Гомельскі аблвыканкам

Прывалаў Уладзімір Аляксандравіч — намеснік старшыні 80232751237;

Гродзенскі аблвыканкам

Лісковіч Віктар Андрэевіч — намеснік старшыні, 80152735644;

Мінскі аблвыканкам

Неўмяржыцкі Сяргей Пятровіч — намеснік старшыні, 5004160;

Магілёўскі аблвыканкам

Некрашэвіч Віктар Уладзіміравіч — намеснік старшыні, 80222501869;

Мінскі гарвыканкам

Шорац Андрэй Віктаравіч — старшыня гарвыканкама, 2224444.

■ Тры пытанні да ўлады

МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ

Клімавіцкі раён адзін з тых рэгіёнаў Магілёўскай вобласці, які атрымаў новыя магчымасці для свайго развіцця. Згодна з 235-м указам Прэзідэнта, ён трапіў пад дзеянне шэрагу льгот і прэферэнцый, якімі змогуць скарыстацца інвестары і камерсанты, якія пачалі сваю справу з 1 ліпеня, і ўсе тыя, хто збіраецца тут жыць і працаваць. На рэалізацыю праграмы выдаткоўваецца каля двух з паловай трыльёнаў рублёў, прадугледжана стварэнне новых прадпрыемстваў ва ўсіх галінах эканомікі. Аб тым, як ідзе справа ў гэтым кірунку, наша размова з намеснікам старшыні Клімавіцкага райвыканкама Аляксандрай МІХЕЕНКАЙ.

— Ці шмат ахвотных скарыстацца магчымасцю пачаць свой бізнес у раёне?

— Да нас звяртаюцца прадпрымальнікі з іншых абласцей, якія нават гатовы да таго, каб згарнуць свой бізнес у сябе, прыехаць у наш раён і займацца вытворчасцю і ўкладваць грошы ў нейкія пэўныя праекты, у прыватнасці ў перапрацоўку сельскагаспадарчай прадукцыі. Польскія інвестары цікавяцца магчымасцямі будаўніцтва невялікага завода па выпуску газасілікатных блокаў для збыту прадукцыі на польскім і расійскім рынках. Ёсць ахвотныя з Брэсцкай вобласці арганізаваць сваю фермерскую гаспадарку і адкрыць на яе базе невялікі мяса-малочны перапрацоўчы цэх. Падставы для цікавасці вельмі сур'ёзныя: за кошт зніжэння падаходнага падатку і адлічэнняў у фонд сацабароны добрасумленныя працадаўцы, якія прывыклі працаваць законна, без усялякіх там канвертаў і шэрых схем, нядрэнна сэканомяць.

— Ужо існуючыя клімавіцкія прадпрыемствы ў чымсьці тут выйграюць?

— Ільготы на іх не распаўсюджваюцца, але будзе магчымасць затрымаць тут спецыялістаў. Крэдыт на будаўніцтва жылля пад 1% на 20 гадоў вельмі добры стымул для гэтага. У нас на чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў пастаянна знаходзіцца каля тысячы чалавек. Гэта сведчыць пра тое, што людзі гатовы будавацца і заставацца ў раёне. Наша задача — стварыць ім працоўныя месцы. З тымі прэферэнцыямі, якія прадугледжвае ўказ, лягчэй прывабіць інвестараў. Калі яны рэалізоўваюць у нас свае праекты, то інжынерная структура будзе зроблена за сродкі бюджэту — а гэта прыблізна 30% кошту любога праекта, вельмі значная сума.

— Наколькі неабходны раёну тыя прэферэнцыі, якія прадугледжвае ўказ?

— Для раёна гэта вельмі сур'ёзная дапамога ў стварэнні новых працоўных месцаў. Сёння паўсюдна вядзецца аптымізацыя вытворчасці, прамысловым прадпрыемствам цяжка выжываць на рынку і яны павінны ісці на скарачэнне колькасці працуючых. Таму новыя вытворчасці проста неабходны. І прыватны бізнес нам тут вельмі добра дапамагае. Асаблівыя поспехі на рахунку нашых дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў, такіх як «Онікс», «Будтэхінвест» (яны працуюць нават з іншымі краінамі).

Наогул, у раёне зарэгістраваны 82 камерцыйныя арганізацыі і звыш 500 прадпрымальнікаў. На іх мы і робім стаўку. Плануем развіваць фермерства. Падчас семінара, які арганізаваў для нас аблвыканкам, наведалі Шклоўскі і Дрыбінскі раёны. І былі ўражаны тым, як там працуюць фермеры. Мы адразу сабралі нашых прадпрымальнікаў, абмеркавалі, што трэба для адкрыцця фермерскай гаспадаркі і чым мы можам ім дапамагчы. Пакуль у нас толькі 8 фермераў на ўвесь раён, але спадзяёмся, хутка будзе болей.

Ёсць у нас што прапанаваць і патэнцыйным інвестарам. У раёне некалькі прывабных інвестпляцовак з інжынернай інфраструктурай, адна з якіх — былы аэрадром у вёсцы Барсукі. З патэнцыялам рэгіёна можна больш падрабязна пазнаёміцца на сайце Клімавіцкага райвыканкама. Мы вельмі зацікаўлены ў ініцыятыўных людзях.

Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.
zigulya@zviazda.by

■ Грамадская думка

СТРУКТУРА МЕРКАВАННЯ

Сацыёлаг пра накіраванасць інтарэсаў, спецыфіку электаральных даследаванняў і экзітполы

Падчас выбарчай кампаніі асаблівую цікавасць для людзей уяўляюць рознага кшталту рэйтынгі, апытанні, падрыхтаваныя айчыннымі і замежнымі сацыёлагамі. Што хвалюе патэнцыяльных выбаршчыкаў? Наколькі змяніўся грамадскі інтарэс за апошнія гады? Чаму часта вынікі сацыялагічных апытанняў адрозніваюцца ад вынікаў выбараў? Пра ўсё гэта «Звяздзе» расказаў Андрэй ПАПУША, намеснік дырэктара Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта.

Фота Надзеі БУЖАН.

— Адным з напрамкаў работы цэнтра з'яўляецца вывучэнне меркавання грамадзян па розных пытаннях. Што сёння хвалюе беларусаў? Пра што сведчаць апошнія апытанні, маніторынгі?

— Згодна з вынікамі нашых даследаванняў, для грамадзян увогуле характэрны аптымістычныя настроі. Яшчэ ў канцы мінулага года 78% беларусаў былі ўпэўнены, што 2015 год складзецца для іх удала. Высокі ўзровень аптымізму сярод насельніцтва пацвярджаюць і даныя апошніх апытанняў, згодна з якімі большасць беларусаў у той ці іншай ступені задаволены ўласным жыццём і ўпэўнены ў будучыні.

Акрамя таго, пераважная большасць грамадзян (84%) ганарыцца сучаснай Беларуссю. Больш за палову жыхароў краіны (55,5%) у першую чаргу ганарыцца беларусамі як народам. Прыродныя багацці краіны выклікаюць пачуццё гонару ў 42% грамадзян, беларуская культура — у 38%. Кожны трэці беларус (33%) ганарыцца гісторыяй краіны і яе спартыўнымі дасягненнямі.

— Наколькі змянілася накіраванасць грамадскага інтарэсу за апошнія 10-15 гадоў?

— Пры супастаўленні вынікаў шматгадовых маніторынгавых даследаванняў варта адзначыць некаторую дваістасць грамадскай думкі. З аднаго боку, яна ўказвае на адвечныя чалавечыя патрэбы і праблемы, актуальнасць якіх практычна не змяняецца з гадамі, а з другога — з'яўляецца аб'ектыўнай рэакцыяй на перамены, што адбываюцца ў грамадстве. Напрыклад, злачыннасць у якасці праблемы сёння згадваецца рэспандэнтамі ў 3 разы радзей, чым у канцы 90-х. У тыя часы гэтая праблема турбавала практычна палову насельніцтва (48,5%), у 2015 годзе гэты паказчык не перавышае 17,5%. Падобная тэндэнцыя адзначаецца і ў дачыненні да іншых праблем: доля грамадзян, занепакоеных палітычнымі супярэчнасцямі ў краіне, за той жа перыяд знізілася з 17% да 2%.

Таксама варта адзначыць істотныя змены ў ацэнцы грамадзянамі ўласнага ўзроўню жыцця: калі ў 1998 годзе лічылі свой дастатак сярэднім толькі чвэрць грамадзян (27%), то ў 2015 годзе такіх стала большасць (75,5%). Пры гэтым у некалькі разоў скарацілася колькасць тых, хто лічыць, што ён знаходзіцца за мяжой беднасці (з 13% да 3%).

Зразумела, меркаванні рэспандэнтаў шчыльна ўпісаны ў агульны сацыяльны кантэкст і часта абумоўлены тымі ці іншымі падзеямі, якія адбываюцца ў краіне і свеце. Адразу пасля сумна вядомага здарэння ў мінскім метро ў красавіку 2011 года, напрыклад, пагрозу тэрарыстычных актаў у якасці актуальнай праблемы паказалі рэкордныя 28% апытаных. Сёння занепакоенасць знешняй палітыкай ЗША праяўляе практычна трэцяя частка апытаных (31,5%), хоць яшчэ ў 2013 годзе паказчык не перавышаў 13%. З высокай ступенню верагоднасці гэта звязана з падзеямі ў суседняй Украіне.

— Электаральныя сацыялагічныя даследаванні — адзін з самых складаных кірункаў дзейнасці сацыёлага. Цяпер ужо ёсць нейкія напрацоўкі па тэме будучых прэзідэнцкіх выбараў? Маецца на ўвазе вывучэнне адносін грамадзян да гэтай падзеі, цікавасці да яе.

— Безумоўна, правядзенне электаральных сацыялагічных даследаванняў звязана з шэрагам цяжкасцяў. Да іх можна аднесці і спецыфіку самой тэматыкі падобных апытанняў, і высокія патрабаванні да даследчай методыкі.

Спецыфіка электаральных даследаванняў таксама заключаецца ў тым, што іх вынікі правяраюцца шляхам супастаўлення з вынікамі галасавання, якое, з сацыялагічнага пункту гледжання, уяўляе з сябе не што іншае, як сацыяльнае сацыялагічнае даследаванне. З гэтай прычыны правядзеннем электаральных апытанняў звычайна займаюцца найбольш прафесійныя і падрыхтаваныя структуры. Усяго ў краіне сёння маюць акрэдытацыю на правядзенне падобных апытанняў чатыры даследчыя арганізацыі, у тым ліку і наш цэнтр. Сацыялагічнае даследаванне сацыяльна-палітычнай сферы з'яўляецца адным з асноўных напрамкаў нашай працы на працягу многіх гадоў.

Пра якія-небудзь канкрэтныя рэйтынгі пакуль рана гаварыць, аднак ужо зараз можна канстатаваць паступовы рост дасведчанасці грамадзян аб маючых адбыцца выбарах і гатоўнасці прыняць у іх удзел. Так, у лютым гэтага года ведалі пра будучыя выбары 91% грамадзян, а планавалі прыняць у іх удзел 89%, а ў маі доля дасведчаных выраслa да 95,5%, а ўзровень актыўнасці — да 91%. Такім чынам, атрыманыя вынікі сведчаць пра высокую ступень гатоўнасці грамадства да пачатку выбарчай кампаніі.

— Часам вынікі апытанняў значна адрозніваюцца ад вынікаў выбараў. З чым, на ваш погляд, гэта звязана? Былі ў практыцы айчынных сацыёлагаў такія выпадкі?

— Пытанне ў тым, наколькі ўвогуле карэктна супастаўляць вынікі электаральных апытанняў і вынікі выбараў. Варта разумець, што перавагі выбаршчыкаў — гэта не пастаянная велічыня, меркаванні грамадзян у перыяд выбарчай кампаніі могуць змяняцца. Гэта красамоўна прадэманстравалі нядаўнія вынікі сацыялагічных апытанняў, праведзеных напярэдадні прэзідэнцкай кампаніі ў Польшчы. У прыватнасці за некалькі месяцаў да старту выбараў дзеючы Прэзідэнт, па звестках апытанняў, упэўнена перамагаў у першым туры, аднак, як мы ведаем, справа ўсё ж дайшла да другога тура, у якім ён саступіў кандыдату ад апазіцыі. І тут нельга казаць аб сур'ёзнай памылцы вымяральнікаў, бо даныя электаральных апытанняў адлюстроўвалі аб'ектыўную сітуацыю на момант правядзення апытання. У гэтым выпадку галоўная задача сацыёлагаў складаецца не ў прадказанні вынікаў галасавання, а ў тым, каб аператыўна адсочваць змены ў перавагах выбаршчыкаў і паказваць на асноўныя тэндэнцыі. Што да прагназавання вынікаў выбараў, то з высокай доляй верагоднасці прадказаць выніковы расклад сіл магчыма толькі ў дзень галасавання з дапамогай методыкі экзітпол (апытанне на выхадзе з выбарчых участкаў).

— Экзітполы, вынікі якіх актыўна цытуюцца ў дзень выбараў, часам даюць няправільную інфармацыю. Гэта сведчыць пра тое, што апытанья не жадаюць гаварыць, за каго яны насамрэч прагаласавалі? Ці справа ў хібнасці?

— У параўнанні з іншымі апытальнымі методыкамі, экзітполы, як правіла, адрозніваюцца большай дакладнасцю. Гэта ў першую чаргу звязана з тым, што апытанне праводзіцца ў дзень выбараў і меркаванне рэспандэнта фіксуецца постфактум, гэта значыць, ужо пасля працэдуры галасавання, што дазваляе пазбегнуць нявызначаных пазіцый. Да таго ж колькасць рэспандэнтаў, апытаных па методыцы экзітпол, як правіла, значна перавышае лік апытаных у рамках традыцыйных электаральных апытанняў, што таксама павышае дакладнасць вынікаў.

У большасці выпадкаў рэспандэнты, пагадзіўшыся прыняць удзел у экзітполе, не хаваюць сваіх палітычных пераваг. У сітуацыі, калі рэспандэнт жадае пакінуць пры сабе сваё меркаванне — ён проста адмаўляецца ад удзелу ў апытанні.

Значныя неадпаведнасці паміж вынікамі выбараў і вынікамі апытання на выхадзе могуць быць звязаны з метадычнымі парушэннямі пры правядзенні экзітполу, невыкананнем патрабаванняў выпадковасці пры адборы рэспандэнтаў, нераўнамерным тэрытарыяльным размеркаваннем пунктаў правядзення апытання...

Варта адзначыць, што прыцягненне да правядзення экзітполаў сацыялагічных арганізацый, якія не маюць дастатковага вопыту ў гэтай сферы, уяўляе з сябе істотны фактар рызыкі. Улічваючы ступень сацыяльнай адказнасці і складанасць правядзення такіх апытанняў, да гэтай працы, як правіла, прыцягваюцца вопытныя даследчыцкія арганізацыі, у тым ліку і міжнародныя, якія маюць добрую рэпутацыю і здольны забяспечыць надзейнасць і дакладнасць вынікаў.

— У чым, на вашу думку як сацыёлага, спецыфіка цяперашняй выбарчай кампаніі?

— Галоўная адметная рыса цяперашняй выбарчай кампаніі заключаецца ў тым, што яна праходзіць ва ўмовах досыць напружанага міжнароднага становішча. Складаная эканамічная сітуацыя як у свеце, так і на постсавецкай прасторы, а таксама падзеі ў суседняй Украіне востра актуалізавалі запыт беларускіх грамадзян на такія базавыя чалавечыя каштоўнасці, як стабільнасць і бяспека.

У гэтым ключы, верагодна, не варта чакаць якіх-небудзь праяў сацыяльнай напружанасці як да, так і пасля выбараў. Мяркую, грамадзяне спакойна скарыстаюцца сваім канстытуцыйным правам і аддадуць голас за таго ці іншага кандыдата. Таксама, я думаю, гэта будзе спрыяць высокай яўцы выбаршчыкаў.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■ Добрая навіна

ЗАРАБІЦЬ І ПАСЯБРАВАЦЬ

Летні працоўны семестр распачаўся ўчора на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі ў Астраўцы. 400 студэнтаў са зводнага беларуска-расійскага атрада атрымалі працоўныя пуцёўкі з рук першага сакратара БРСМ Андрэя Белякова, камандзіра Цэнтральнага штаба грамадскай арганізацыі «Расійскія Студэнцкія Атрады» Сяргея Кісялёва, кіраўніцтва БелАЭС, прадстаўнікоў абласнога і раённага выканаўчых камітэтаў.

Сёлета на будаўніцтве АЭС будзе працаваць 21 лінейны атрад, гэта амаль у два разы болей, чым у 2014-м. Кожны з іх ужо традыцыйна носіць імя аднаго з Герояў Савецкага Саюза. Беларускія студэнты прадстаўляюць ВНУ з усіх рэгіёнаў краіны. Расіяне прыехалі з універсітэтаў Масквы, Белгарадскай і Калужскай абласцей. Абавязковыя патрабаванні да «байцоў» — узрост не меншы за 18 гадоў, наяўнасць будаўнічай спецыяльнасці не ніжэй за 2-3 разрад, выдатнае здароўе. Зводны атрад будзе знаходзіцца ў Астравецкім раёне да 28 жніўня.

— З мноства добрых спраў, якія ў свой час рэалізаваў камсамол, мабыць, адной з самых маштабных і карысных для моладзі і для краіны ўвогуле быў будатрадаўскі рух, — зазначыў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ЛІСКОВІЧ.** — Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі лічыць сябе спадкаемцам камсамола і робіць вельмі правільна, што адраджае будатрады. Гэта зусім не водгук мінулага, а значная цяпер з'ява.

Пасля адкрыцця семестра студэнты заклалі «Алею гонару студэнцкіх будаўнічых атрадаў». Таксама падчас мерапрыемства адбыліся першыя адкрытыя дэбаты ў межах новага праекта БРСМ «ВЫБІРАЙ. BY!», удзел у іх прынялі прадстаўнікі беларускіх і расійскіх студатрадаў. Моладзь абмеркавала найбольш актуальныя праблемы студатрадаўскага руху, выказала прапановы па наданні яму новага імпульсу.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ

УРАГАН НАШКОДЗІЎ У МІНСКУ

Шквалісты вецер вечарам панядзелка дабавіў працы сталічным супрацоўнікам МНС. Паводле інфармацыі прэс-службы ведамства, шматлікія паваленыя дрэвы пашкодзілі не менш за пяць аўтамабіляў. Так, на вуліцы Пляханава дрэва звалілася на легкавы аўтамабіль «Сузукі Балена». Яшчэ чатыры машыны атрымалі нязначныя пашкоджанні на вуліцах Кісялёва і Прытыцкага. А на вуліцы Няжданава дрэва ўпала на пенсіянерку. Жанчыну шпіталізавалі.

Акрамя таго, у 90 населеных пунктах Барысаўскага, Бярэзінскага, Крупскага і Лагойскага раёнаў адключылася электрычнасць.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

СВІННЮ НЕ ПАДКЛАДУЦЬ

На тэрыторыі суседніх краін зарэгістраваны выпадкі захворвання свіней на афрыканскую чуму (АЧС).

Таму наша краіна з 7 ліпеня абмяжоўвае ўвоз свініны з Саратаўскай вобласці Расіі і Ровенскай вобласці Украіны, пра што паведамілі ў дэпартаменце ветэрынарнага і харчовага нагляду Мінсельгасхарча Беларусі. Таксама з гэтай даты ўводзяцца часовыя абмежаванні на ўвоз у краіну з названых абласцей і прадукцыі перапрацоўкі свініны, у тым ліку ад дзікоў, гарбарнай, рогакапытнай і кішачнай сыравіны; паляўнічых трафеяў, атрыманых ад успрымальных відаў жывёл; кармоў і кармавых дабавак для жывёл расліннага і жывёльнага паходжання, у тым ліку з птушкі і рыбы; кармавых дабавак для катоў і сабак; гатовых кармоў для катоў і сабак, якія не прайшлі тэрмічную апрацоўку, вырабленых з сыравіны, якая атрымліваецца з Саратаўскай вобласці Расіі і Ровенскай вобласці Украіны; былога ў выкарыстанні абсталявання для транспарціроўкі свіней і сыравіны (прадукцыі) жывёльнага паходжання, забою і раздзелкі свіней.

Асобна ў дэпартаменце адзначылі, што «неабходна прыняць дадатковыя меры кантролю па забеспячэнні біялагічнай абароны буйных свінагадоўчых комплексаў, свінагадоўчых ферм і гаспадарак усіх форм уласнасці». Усе раней выдадзеныя дазволы на ўвоз у Беларусь вышэйзгаданых тавараў з Саратаўскай вобласці Расіі і Ровенскай вобласці Украіны адмяняюцца.

Паводле інфармацыі Міжнароднага эпізаатычнага бюро (МЭБ), новыя выпадкі захворвання жывёл на АЧС зафіксаваны таксама ў Польшчы на тэрыторыі Падляскага ваяводства. Такім чынам, дэпартамент нагадвае пра неабходнасць прыняцця мер па недапушчэнні ўвозу ў Беларусь пералічаных вышэй тавараў са свініны і з гэтага рэгіёна.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

ТВОЙ РЭЙТЫНГ — У ПЕРСАНАЛЬНЫМ КАБІНЕЦЕ

Ва ўсіх абітурыентаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта з'явілася магчымасць стварыць свой персанальны віртуальны кабінет. Электронны рэсурс прызначаны для папярэдняй рэгістрацыі абітурыентаў і іх наступнага інфармавання аб ходзе прыёмнай кампаніі.

У персанальным кабінеце размешчана форма анкеты для паступлення. Не выходзячы з дому, анкету можна запоўніць, раздрукаваць і прынесці разам з астатнімі дакументамі ў прыёмную камісію. У асабістым кабінеце абітурыенту будуць даступныя таксама звесткі пра яго бягучы рэйтынг сярод тых, хто паступае на тую ці іншую спецыяльнасць (групу спецыяльнасцяў пры агульным конкурсе), расклад экзаменаў (калі яны праводзяцца на выбранай спецыяльнасці), графік гутаркі з дэканам факультэта, а таксама вынікі залічэння. Уся пералічаная інфармацыя будзе даступная абітурыенту ў анлайн-рэжыме.

Стварыць асабісты кабінет можна на сайце БДУ, перайшоўшы па спасылцы http://abit.bsu.by/.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

ГРОШЫ ЗАТРАЦІЛІ. А ЭФЕКТ?

Медыцынскае абсталяванне, набытае за бюджэтныя сродкі, не заўсёды эфектыўна выкарыстоўваецца. Гэта зазначае Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці.

У 2013—2014 гадах медыцынскія ўстановы Гродзеншчыны дзякуючы сродкам рэспубліканскага бюджэту атрымалі фібрагістэраскопы з прыладамі і эндавідэакамеры ў колькасці 24 штук коштам 5,3 мільярда рублёў. Аднак не ўсюды гэтае абсталяванне дае належную аддачу. У Шчучынскай цэнтральнай раённай бальніцы, напрыклад, з моманту атрымання ў студзені мінулага года яго задзейнічалі толькі двойчы. Прычына — адсутнічаюць умовы для правільнай стэрылізацыі прыладаў гэтага абсталявання, якая павінна праводзіцца ў газавых камерах. Акрамя таго, у штаце павінна быць пасада ўрача-анестэзіёлага. Аналагічнае абсталяванне коштам 248 мільёнаў рублёў не выкарыстоўваюць і ў жаночай кансультацыі № 4 г. Гродна.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prakopchik@zviazda.by*

■ Конкурс

ДОМ НАСТУПНАГА СТАГОДДЗЯ

Дзетак запрашаюць памарыць з алоўкамі ў руках

Цікава, якой бачаць архітэктуру роднай Беларусі сучасныя дзеці і падлеткі і што для іх значыць архітэктурная спадчына краіны? А яшчэ, як яны ўяўляюць сабе дамы і будынкі, якія будуць узведзены праз 100 гадоў? На гэтыя і іншыя пытанні паспрабуюць адказаць удзель-нікі рэспубліканскага конкурсу дзіцячай творчасці «АрхНавацыя-2015».

Сёлета мерапрыемствы конкурсу пройдуць у рамках Беларускага архітэктурнага тыдня, які пачнецца ў першай дэкадзе кастрычніка. У прэс-службе Мінбудархітэктуры паведамілі, што конкурс «АрхНавацыя» праводзіцца ў краіне ўжо чацвёрты раз, а яго ініцыятарам выступае Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі пры садзейнічанні Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. За прызавыя месцы могуць пазмагацца як індывідуальныя ўдзельнікі, так і навучэнцы аб'яднанняў па інтарэсах устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і іншых устаноў адукацыі. Узрост удзельнікаў конкурсу складае ад 4 да 20 гадоў.

Для ўдзелу ў «АрхНавацыі-2015» прымаюцца жывапісныя і графічныя работы (фармат А3, А2), архітэктурныя макеты, мастацкія фатаграфіі памерам А4 і А3, а таксама відэаролікі. Юныя таленты могуць паспрабаваць свае сілы ў трох тэматычных намінацыях: «Архітэктурныя фантазіі» (праекты новай архітэктуры, дамоў XXII стагоддзя, горадабудаўніцтва будучыні і інш.), «Архітэктурная спадчына» (архітэктура і збудаванні старажытнай і сучаснай Беларусі) і «Храмы памяці» (гісторыка-культурныя комплексы, мемарыялы, помнікі, прызначаныя для ўшанавання падзей Вялікай Айчыннай вайны, існуючыя і новыя праекты). Конкурсныя работы прымаюцца не пазней 9 кастрычніка па адрасе: 220030, Рэспубліка Беларусь, горад Мінск, вуліца Кірава, 16, Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі (сектар выставачнай работы).

Нагадаем, што летась журы давялося ацаніць звыш тысячы творчых работ, якія былі прадстаўлены ў намінацыях «Жывапіс» і «Графіка», а таксама больш за сто фатаграфій, 30 відэаролікаў і 35 архітэктурных макетаў. У выніку 14 чалавек названы пераможцамі, 47 — прызёрамі. Акрамя таго, аўтары яшчэ каля сотні найбольш яркіх твораў узнагароджаны граматамі Мінбудархітэктуры і Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

■ Канфіскат

НЕ ДАЛІ ДАБРО

Днямі беларуская мытня спыніла адразу некалькі спроб вывазу культурных каштоўнасцей за мяжу.

Рарытэтны аўтамабіль Bentley 1929 года выпуску затрымалі гродзенскія мытнікі ў пункце пропуску «Брузгі». Машына, за рулём якой знаходзіўся грамадзянін Расійскай Федэрацыі, накіроўвалася на выезд з тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза праз «зялёны» калідор і не была задэкларавана як культурная каштоўнасць. Комплексная экспертыза пацвердзіла гістарычную і культурную вартасць транспартнага сродку, які быў забраны ва ўладальніка да таго, як суд вынесе рашэнне.

Кошт дадзенай мадэлі Bentley ў залежнасці ад розных параметраў дасягае 1 мільёна долараў. Экзэмпляр, канфіскаваны ў «Брузгах», быў ацэнены ў 7 мільярдаў рублёў (прыкладна 450 тысяч долараў).

Яшчэ адна культурная каштоўнасць, праўда, меншага памеру была выяўлена супрацоўнікамі Мінскай рэгіянальнай мытні на пошце. Як паведамляе прэс-служба Дзяржаўнага мытнага камітэта, у міжнародным адпраўленні знаходзілася ўнікальная старажытнагрэчаская манета. Пасылку спрабавалі перадаць у Злучаныя Штаты з Бабруйска, і яна таксама не суправаджалася адпаведнай дэкларацыяй.

Матэрыялазнаўчая і гістарычная экспертызы ідэнтыфікавалі манету як 1 грэчаскую

Фота БЕЛТА.

тэтрадрахму, якую адчаканілі прыблізна ў 500 годзе да нашай эры (пачатак эпохі найвышэйшага росквіту старажытнагрэчаскай цывілізацыі і славутых грэка-персідскіх войнаў) са сплаву срэбра, медзі і жалеза. Экзэмпляр ацэньваецца прыкладна ў 1 200 долараў. Па факце быў распачаты адміністрацыйны працэс.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■ На кантролі

«РАЯЛЯ Ў КУСТАХ» НЕ АТРЫМАЛАСЯ

Падчас правядзення праверачных мерапрыемстваў па дзяржаўных закупках супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ГУУС Мінгарвыканкама разам з калегамі з Цэнтральнага РУУС выявілі парушэнні пры правядзенні працэдуры закупкі дарагога... раяля.

Яе заказчыкам і ініцыятарам выступіў адзін з музеяў сталіцы. Пераможцам, што атрымаў права пастаўкі музыкальнага інструмента, стала адна мінская кампанія з цаной прапановы больш за 570 мільёнаў рублёў. З ёй і быў заключаны дагавор на названую суму. Аднак аператыўнікі выявілі істотныя парушэнні ў конкурсных дакументах пры правядзенні дзяржзакупкі. І калі гэты працэс прааналізавалі, было прынята рашэнне аб скасаванні здзелкі. У выніку папярэджана нанясенне шкоды бюджэту ў памеры больш за 570 мільёнаў рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

ОАО «Стройтрест № 35»

объявляет о созыве внеочередного общего собрания акционеров 03 августа 2015 г. в 14 часов 30 минут.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

«О начислении и выплате дивидендов за первое полугодие 2015 г.».

В **суд Речицкого района Гомельской области** поступило заявление об объявлении умершим Гарбузова Олега Игоревича, 13 августа 1972 года рождения, проживавшего по последнему известному адресу: Гомельская область, г. Речица, ул. Панова, 3/89.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить в суд Речицкого района в течение 2-х месяцев со дня публикации имеющиеся сведения о Гарбузове Олеге Игоревиче.